«Дзеці ў пясочніцах на касцях гуляць не будуць»

З ГІСТОРЫІ ПЫТАННЯ

У квартале, абмежаваным цяперашнімі вуліцамі Дзяржынскага, Куйбышава, Савецкай і праспектам Машэрава, падчас вайны знаходзілася гета. Паводле гістарычных звестак, у першыя два гады вайны было знішчана 28 тысяч брастаўчан яўрэйскай нацыянальнасці. Тысячы вязняў вывозілі і расстрэльвалі за горадам, таксама ў Бярозаўскім раёне, іншых забівалі на месцы, тут жа закопвалі. Як расказваюць карэнныя брастаўчане, у 50-х, 60-х, 70-х гадах астанкі людзей таксама знаходзілі, вывозілі кудысьці. Але рабілі гэта ціха, амаль засакрэчана. Зараз жа ніхто і ўявіць не мог, што тут яшчэ ляжаць косці тысяч ахвяр халакосту. Нядаўнюю сустрэчу з журналістамі **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** пачаў з гісторыі пытання.

— На жаль, гэта не метафара, што Брэст стаіць на касцях. На месцы плошчы Леніна былі могілкі часоў Першай сусветнай вайны. У цэнтральным гарадскім парку справа ад дыскатэкі ляжаць нямецкія салдаты, з левага боку — венгерскія вайскоўцы. Нядаўна па праспекце Машэрава ў раёне помніка Афанасію Брэсцкаму ўзнялі для перапахавання рэшткі салдат Вермахта. Падчас рэканструкцыі Гарадскога саду сёлета знайшлі сляды пахавання і чалавечыя косці.

Многа налічваецца трагічных старонак у гісторыі тысячагадовага горада над Бугам, асабліва іх шмат у XX стагоддзі. Але трагедыя гета стаіць асобна менавіта з-за колькасці ахвяр. Зноў яна напомніла аб сабе цяпер.

РАСКОПКІ

У самым пачатку года на азначаную пляцоўку прыйшоў забудоўшчык — чарговы інвестар. Чарговы, таму што гэта не першая спроба прывесці да ладу квартал у цэнтры горада з напаўбарачнымі будынкамі, вулічнымі туалетамі. Быў ужо італьянец у 2007 годзе. Але з ім дагавор вымушаны былі скасаваць, бо інвестар не выконваў уласных абавязацельстваў. Толькі ў 2016 годзе знайшоўся новы патэнцыйны інвестар. Спатрэбіўся час для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі, іншых падрыхтоўчых мерапрыемстваў. І ў студзені будаўнічая кампанія прыступіла да работы. 17 студзеня падчас пракладкі катлавана знайшлі першыя астанкі. Ужо 18 чысла гарвыканкам

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

У раёне будоўлі.

звярнуўся ў Міністэрства абароны з адпаведнай просьбай. І хоць план пошукавых работ на год быў даўно зацверджаны, міністэрства пайшло насустрач. Усе раней намечаныя работы былі адменены, праз некалькі дзён асабовы склад 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна Мінабароны быў у Брэсце. Літаральна ў першы тыдзень раскопак стала ясна, што ўсе папярэднія разлікі-меркаванні нічога не вартыя. Бывалі дні, калі байцы паднімалі астанкі дзясяткамі, ледзь не сотнямі за дзень.

— З самага пачатку мы ведалі, што можам наткнуцца на сляды пахаванняў, аб гэтым быў папярэджаны інвестар, але такой лічбы ніхто не чакаў. Нават гісторыкі. Гэта быў шок! — не хавае эмоцый Аляксандр Рагачук.

ФОРМЫ ЎВЕКАВЕЧВАННЯ

У гарвыканкам тады запрасілі кіраўнікоў яўрэйскіх абшчын Брэста. З імі былі абмеркаваны далейшыя дзеянні па ўвекавечванні памяці. Грамадскія актывісты ў цэлым згадзіліся з тым, што прапаноўваў гарадскі выканаўчы камітэт. Галоўнае, што месца пахавання не трапляе канкрэтна пад забудову. Гэта значыць, фундаменты будынкаў не кладуцца на грунт, у якім да нядаўняга часу знаходзіліся косці. Адлегласць ад трансэі-магілы да бліжняй сцяны складае пяць метраў. Тут не будзе гульнявых пляцовак, нават не будзе паркоўкі альбо нечага падобнага. Толькі зялёная трава.

Вось са знакам альбо абазначэннем месца пахавання трэба як след падумаць, лічыць старшыня гарвыканкама. З ім нельга не пагадзіцца. Зараз, дарэчы, мясцовая ўлада прапануе вынесці знак-барэльеф на праспект Машэрава. Гэта адна з вуліц, якія абмяжоўваюць названы квартал, і галоўная магістраль горада. На гэтым месцы знак будзе больш прыкметны і для гараджан, і для турыстаў. А помнік вязням гета знаходзіцца менш чым за сто метраў ад названага квартала. Магчыма, яго трэба абнавіць і ўдасканаліць альбо на яго месцы наогул паставіць новы. Пакуль гэтыя пытанні знаходзяцца на ўзроўні прапаноў і адкрытыя для абмеркавання. Інвестар «Прыбужскага квартала» гатовы прафінансаваць увекавечванне нявінных ахвяр фашызму.

ПЕРАПАХАВАЦЬ І ПОМНІЦЬ

Астанкі былых жыхароў горада будуць перапахаваныя ў маі на Паўночных могілках. Там, дарэчы, ужо знайшлі спакой астанкі з месца расстрэлу 350 яўрэяў у Гершонах. Праект мемарыяла распрацоўвае гарадская архітэктура па даручэнні кіраўніцтва горада. Магчыма, гэта будзе нейкая агульная магіла з абеліскам, якую абазначаць архітэктурнымі формамі. Пасля таго як скончацца работы па эксгумацыі ўсіх астанкаў, а таксама шурфаванне ўсёй тэрыторыі, стане вядомым дзень перапахавання. На цырымонію зможа прыйсці кожны, каму неабыякавае мінулае горада, хто захоча ўшанаваць памяць ахвяр вайны. Гэтая кампанія пройдзе за кошт сродкаў гарадскога бюджэту. Далучыцца, у тым ліку да фінансавання, могуць усе ахвотныя.

— Цяперашнія прыборы і тэхналогіі даюць магчымасць вельмі дакладна абследаваць зямлю, — сказаў старшыня гарвыканкама. — Мне прынцыпова важна, каб дзеці ў пясочніцах не гулялі на касцях. Таму і праводзіцца такая скрупулёзная работа, абследуецца кожны сантыметр зямлі. Усе астанкі людзей будуць узнятыя на паверхню і належным чынам пахаваныя. Гэта ж страшна, нават уявіць і асэнсаваць цяжка, што людзей стралялі тысячамі і закопвалі абы-як, фактычна толькі прысыпалі.

X X X

Недзе ў інтэрнэце прамільгнула пытанне-разважанне, звязанае з цяперашнімі брэсцкімі раскопкамі: «Няўжо ніхто не спрабуе ідэнтыфікаваць рэшткі на прадмет сваяцтва?» Наіўнае пытанне. Няма каму гэта рабіць. Знішчалі ж цэлымі сем'ямі. Забівалі нямоглых старых і груднічкоў-немаўлят. У гэтым пекле не засталося цётак-пляменнікаў, стрыечных братоў і сясцёр. У кнізе «Памяць. Брэст» ёсць спісы 12 тысяч вязняў-ахвяр гета, тых, каго ўдалося ўстанавіць. Там значыцца, напрыклад, 11 чалавек з прозвішчам Высоцкі. Магчыма, гэта далёкія сваякі знакамітага спевака. Як вядома, дзед Уладзіміра Высоцкага быў родам з Брэста. З брэсцкіх Высоцкіх не засталося нікога. Як і з сем'яў Авярбухаў, Балглеяў, Гольдманаў, Пятрушкаў, Шчадравіцкіх, Рапапортаў... Нядаўна размаўляла з маладой жанчынай, бабуля і дзядуля якой прыехалі адразу пасля вайны ў Брэст на работу. Ім прапанавалі на выбар пустыя яўрэйскія кватэры з мэбляй, посудам, адзеннем. Яны занялі адну і сталі жыць, як і іншыя іх суседзі... Я гэта да таго, што ніколі не шкодзіць ведаць гісторыю свайго горада. Дый справа гонару цяперашніх гараджан, іх абавязак — прыстойна аддаць даніну павагі людзям, што загінулі ў 1941—1942 гадах. І помніць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тэатр

ШАГАЛ У... РУКАХ!

Напярэдадні Міжнароднага дня лялечніка, які святкуецца 21 сакавіка, у віцебскім Беларускім тэатры «Лялька» ўпершыню паказалі спектакль «Мастак. Вяртанне ў Віцебск».

Рэжысёр спектакля і мастацкі кіраўнік «Лялькі» Віктар Клімчук у новым спектаклі пры дапамозе лялек пастараўся пазнаць свет Шагала, яго творчае станаўленне і цярністы шлях да сусветнай славы. Пра выпрабаванні, праблемы і перажыванні Марк Шагал напісаў у аўтабіяграфіі «Маё жыццё», якая і стала асновай п'есы і спектакля.

Галоўную ролю мастака выканаў адзін з самых вопытных акцёраў «Лялькі» Юрась Франкоў, ён прызнаўся, што новая роля — самая складаная ў яго творчай кар'еры.

Падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» тэатр з'яўляецца сталіцай праекта «Лялечны квартал». Пачынаючы з 2014 года, жыхары і госці Віцебска маюць магчымасць пабачыць спектаклі для дзяцей і дарослых не толькі на сцэне: традыцыйна сталі вулічныя спектаклі і перформансы.

Прэм'ера спектакля «Мастак. Вяртанне ў Віцебск».

Прафесійны ўзровень «Лялькі» ўжо шмат разоў высока ацэньваўся на конкурсах, фестывалях, ды іншых творчых акцыях у розных краінах, дзе спектаклі на беларускай мове добра ўспрымаліся нават без перакладу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Запрашальнік

КАМУ ПАЭЗІІ? УСІМ!

Мінск ужо другі раз далучыўся да міжнароднага фестывалю «Сусветны дзень паэзіі», што пройдзе 21 сакавіка ў 60 гарадах 10 краін свету.

Галоўнай пляцоўкай свята ў беларускай сталіцы будзе Дом Масквы. Тут адбудзецца вялікі паэтычна-музычны канцэрт з удзелам музычных гуртоў і лаўрэатаў конкурснай часткі фэсту, выстаўка-кірмаш мастацкай і вучэбнай літаратуры і буккросінг усляпую. Уваход на мерапрыемства бясплатны, але пажадана мець з сабой кнігу на абмен — з дамашняй бібліятэчкі альбо напісаную вамі, калі вы пачынаючы ці вопытны аўтар. Палова кніг, якія прынясуць наведвальнікі фестывалю (сярод іх чакаюцца ў тым ліку прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі), будзе перададзена дабрачыннаму фонду «Белы бусел» і трапіць да маленькіх пацыентаў анкацэнтра ў Бараўлянах, а таксама да выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў у Вілейцы і Навагрудку для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення. Дарэчы, на асобным стэндзе будуць прадстаўленыя і самвыдатаўскія кнігі, напісаныя дзецьмі з анкацэнтра.

Акрамя таго, арганізатары прапануюць гасцям мноства дадатковых цікавінак і забаў: выстаўку жывых скульптур ад эксперыментальнага тэатра-студыі «Залаты рэжысёр» у суправаджэнні сапраўднай кельцкай арфы, інтэрактыўнае тэатралізаванае прадстаўленне, раздачу скруткаў з прадказаннямі на вершах, сувенірны кірмаш і адмысловую фотазону. «Прыходзьце, мы раздадзім #усімпаэзіі», — запэўнівае **куратар фестывалю ў Мінску паэтка Ганна БУХТА.**

Вікторыя ЗАХАРАВА.